**Мішчанчук М.І. (Брэст)**

## Формула адзінства: Багдановіч – Лермантаў – Максім Танк

«Ўсе знікае, праходзіць, як дым, / Светлы ж след будзе вечна жывым» [1, с. 104] – гэтымі тужліва-светлымі, пранікнёна-філасофскімі радкамі заканчваецца верш «С.Е. Палуяну», якім адкрываецца другая частка «Вянка» М. Багдановіча – самая рознадумная, самая аналітычная, самая апавядальна-маналагічная, з вобразам-канстантай (а можа ўніверсаліяй) – Дума. Дума, роздум, ацэнка, асэнсаванне кароткага, імгненнага, але, як след зоркі ў цемені, як зіхаценне і згасанне ў небе глухім (невыпадковы эпітэт) залатога змея, жыцця дваццацігадовага крытыка-прафесіянала, што рана, па сваёй волі, закончыў зямны шлях. І не толькі шляху яго, але і свайго, таксама кароткага і бліскучага. Ён прарочыў і сабе тое, што мы сёння маем: «Але ўспомніць яшчэ зорку свет, / Бо у сэрцах гарыць яе след. / Так свабодна, так ярка пражыць – / Лепшай долі няма на зямлі» [1, с. 104].

Ён прарочыў сабе памяць у людскіх сэрцах. Але ці прадбачыў, што будзе прызнаны класікам нашай літаратуры? Наўрад. Бо ў другім вершы змясцілася іншае – выпакутаваная, праз слёзы выказаная аграмадная скарга-жальба не толькі М.А. Кіцішынай, а ўсяму свету: «....Помню, раз пазабыў сваё гора, – / Гэта чуда зрабіў Ваш прывет. / Я бальны, бесскрыдлаты паэт! / Мо жыцця майго верш ужо спет, – / Дык няхай Вам хоць песня гавора, / Як бальны, бесскрыдлаты паэт / На гадзіну забыў сваё гора» [1, с. 219].

Тэзіс і антытэзіс сышліся ў працытаваных творах: святло, вера, надзея – пачуццё бяссілля, боль, абвостраны імгненнай радасцю, і няўлоўная зняверанасць, ці дакладней – няўпэўненасць у сваіх сілах, сваім таленце. Другі верш напісаны ў 1909 г., як і першы, таму часавая «роднаснасць» відавочная, бясспрэчная. І гэты твор не менш характэрны для настрою паэта, для яго творчасці. Ён, як і да яго падобныя «сумныя» тужлівыя маналогі-споведзі, – антытэзіс (па Гегелю) лірыцы веры, упэўненасці ў будучым пазітыве. Гэта другі бок творчасці нашага Страціма-лебедзя, пра які і пойдзе далейшая размова, прытым – у кантэксце, у атачэнні набыткаў яшчэ двух творцаў прыгожага пісьменства – Міхаіла Лермантава і Максіма Танка.

Правамоцнасць падобнага параўнання трыяды грунтуецца на некалькіх фактарах. Па-першае, усе названыя пісьменнікі – класікі слоўнага мастацтва. Па-другое, кожны з іх паспытаў горыч адзіноты ці на працягу ўсяго жыцця (М. Багдановіч, М. Лермантаў), ці на яго заключным перыядзе (Максім Танк). Адчуванне адзіноцтва, імкненне яго пераадолець прадвызначылі ў многім агульныя (сентыментальны і трагедыйны) разнавіднасці пафасу і адсюль – пераважна элегічны жанр (нягледзячы на пэўныя выключэнні) як дамінантны ў іх творчасці. Адзначым таксама, што названыя аўтары былі настроеныя на эксперымент па некалькіх узроўнях: тэматычным, жанравым, вершатворчым, слоўна-выяўленчым (мінівобразным). І, нарэшце, параўнанне грунтуецца на фактары асабістай зацікаўленасці, напрыклад, М. Багдановіча творчасцю свайго папярэдніка, нераўнадушнымі адносінамі да Максіма Кніжніка Максіма Танка.

Пачуццё адзіноцтва – вызначальны фактар лірыкі М. Багдановіча, лірыкі, паэтычнага эпасу і прозы М. Лермантава. У меншай ступені яно ўласцівае Максіму Танку – выявілася ў кнігах «За маім сталом» (1984), «Збор калосся»

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

(1989), «Errata» (1992). У адрозненне ад сваіх папярэднікаў, Максім Танк у пачатку творчасці, а затым і ў ваенную пару, у пасляваенныя дзесяцігоддзі дэклараваў адкрытую грамадзянскасць, абвяргаў адзіноцтва як своеасаблівы духоўны (душэўны) стан. У 1974 г. з-пад яго пяра выйшлі вось гэтыя шчырыя і пранікнёныя радкі верлібра: «І радасць – ніякая радасць, а горыч, / І песня – ніякая песня, а скарга, / І страва – ніякая страва, а камень, / І брага – ніякая брага, а слёзы, / І сонца – ніякае сонца, а крыга, / Калі ты на свеце ўсім гэтым / Не маеш з кім падзяліцца» [5, с. 310]. Аднак пад канец жыцця настрой (матыў) адзіноцтва, адчуванне неабходнасці перагледзець ранейшы шлях, трывога за духоўны стан грамадства наблізілі паэзію Танка да творчасці яго папярэднікаў, надалі ёй адценне элегічнага суму і смутку.

У паэзіі М. Лермантава і М. Багдановіча «трансляцыя» матыву адзіноцтва абумоўлена абставінамі асабістага жыцця (ранняя смерць маці, канфлікты сямейнага характару, адарванасць – не па сваёй волі – «ад родных ніў, ад роднай хаты»), блізкасцю характараў (самазаглыбленасць, замкнёнасць, «закрытасць» адносін да чужых (новых) людзей), узроставымі асаблівасцямі (амаль аднагодкі), калі востра адчуваюцца «перакосы» у жыцці, максімалізуюцца няўдачы і страты. Адзінокасць М. Лермантава ўрэшце рэшт вылілася ў дэманізм як форму пратэсту супроць абставін (паэма «Демон», раман «Герой нашего времени»). Адзінокасць М. Багдановіча «застыла» на ўзроўні скаргі і наракання на свой лёс (дамінантным творам у дадзеным выпадку з'яўляецца «Страцім-лебедзь»). Беларускі паэт прысвяціў класіку рускай літаратуры, будучы яго аднадумцам па настрою, пафасу, артыкул, які назваў лаканічна і дакладна – «Одинокий». Змест артыкула адлюстроўваецца, як у люстэрку, у гэтым загалоўку і зводзіцца да прызнання адзіноцтва як стану душы, які нараджае «пакуту і апатыю», выклікае «імкненне да самааналізу». Вынікам падобнага псіхалагічнага стану, лічыць крытык, і з'яўляецца «о д н о р о д н о с т ь (вылучана М. Багдановічам. – *М.М.*)» [2, с. 250] тропаў, эпітэтаў, слоў, «складнікаў твора», што вядзе да «паўтарэння пройдзенага». У канцы артыкула паэт выходзіць на пазітыў, адзначае, што ранняя смерць перашкодзіла канчатковаму перараджэнню творчай асобы рускага мастака слова, аднак, і ў зробленых ім рэчах «есть много такого, что навсегда сделалось радостью жизни для очень многих людей» [2, с. 253]. Адзначым, што беларускі паэт, як толькі мог, пераадольваў сваё адзіноцтва, шчасліва пазбег таго недахопу – паўтарэнне матываў, тэм, мастацкіх сродкаў, – які заўважыў у творах папярэдніка.

Матыў адзіноцтва (адзіноты) – адзін з дамінантных у беларускай і рускай літаратурах XIX–XXI стст. А. Гарун адзін з лепшых твораў так і назваў – «Літасць адзіноце». Здаецца, па агульным пафасе і настроі менавіта ён, а не Я. Купала і Я. Колас (выкажам такую «крамольную думку») бліжэй стаіць да Максіма Кніжніка.

Псіхалагічны настрой (чуццё) адзіноты становіцца жанраўтваральным фактарам у паэзіі трох мастакоў слова (у большай ступені – у спадчыне М. Багдановіча і М. Лермантава), абумоўлівае прыярытэтнасць элегіі. Прычым гэты жанр мы разумеем шырэй, чым пададзенае тэрміналагічнымі слоўнікамі вызначэнне: маўляў, элегія – сумны твор, з заключаным у ім пафасам

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

расчаравання жыццём. У манаграфіі «Ёсць у паэта свой аблог цалінны» (1992), мы паспрабавалі паводле ацэнкі творчасці А. Куляшова, Я. Янішчыц, Т. Бондар, апошняй кнігі А. Астрэйкі «Памяць дарог» вылучыць зместавыя мадыфікацыі элегій. Такія, як элегія суму, смутку, элегія скаргі, жальбы, элегія расчаравання, элегія трагедыйнага, канчатковага расчаравання, элегія з іранічнай ці сатырычна-з’едлівай «падсветкай» і г.д.

Паводле вызначанай намі класіфікацыі, залежнай ад нарошчвання пафасу незадаволенасці, М. Багдановіч і М. Лермантаў, без сумнення, элегійныя паэты. У беларускага паэта пераважае элегія сентыментальнага характару. Скразнымі матывамі такіх яго твораў, як «Сумна мне, а ў сэрцы смутак ціха запявае…», «Не кувай ты, шэрая зязюля...», «Ян і маці», «Сэрца ные, сэрца кроіцца ад болю…» (цыкл «Згукі Бацькаўшчыны» ў «Вянку»), «Старасць», «Цемень» і інш., становяцца скарга на бязлітасны лёс, расчараванне ў жыцці. У вершы «Цемень» пачуццё расчаравання нават перарастае ў пачуццё невыноснага болю, акрэсліваецца трагедыйнымі вобразамі-канстантамі «пустата» і «імгла». Маланка, што прабіла на імгненне цемень, асвяціла вобраз Хрыста, «яго крыж» і знікла. Твор заканчваецца на высокай трагедыйнай ноце: «Зноў навокал цемнь. Свет зірнуў і пагас. / Не глядзіць на мяне ясны вобраз Хрыста, / Над зямлёю імгла, у душы пустата» [1, с. 214]. Адточаныя, лаканічныя (як у Я. Баратынскага, акадэмічны двухтомнік якога адрэцэнзаваў наш паэт) радкі.

Другой разнавіднасцю элегіі М. Багдановіча з’яўляецца элегія з ясна выражанай адычнай «падсветкай», з фактарам веры ў будучыню («Пагоня», «Не бядуй, што хмары…», «Д.Д. Дзябольскаму», «Ціхія мае ўсе песні…», «Слуцкія ткачыхі», многія вершы з вянкоўскага цыкла «Думы» і інш.). Такія творы (колькасна іх менш, чым з матывамі расчаравання і смутку) часта ўтрымліваюць пазітыўную інвектыву накшталт вось гэтай, агульнавядомай: «Жывеш не вечна, чалавек, – / Перажывí ж у момант век!» [1, с. 121].

І яшчэ адна разнавіднасць элегіі выразна выяўляецца ў творчасці М. Багдановіча – медытатыўная, філасофская – пра «вечныя» тэмы жыцця і смерці, кахання і смерці, спосабаў існавання – актыўнага і пасіўнага, рэальнага і мройнага, фантазійнага. Элегійны жанр увогуле «падпітваецца» роздумам, разважаннем, адносіцца да «поэзии мысли», па трапным вызначэнні А. Пушкіна і В. Бялінскага. У Максіма Кніжніка верш-роздум набыў уласцівыя яму стылёвыя рысы, найпершая з якіх – доказнасць. Уяўляюцца ў сувязі са сказаным невыпадковымі назвы цыклаў і твораў: «Думы» (гэта значыць «роздумы», «разважанні»), «Каханне і смерць», «Усё адна цяпер мне думка сэрца сушыць…», інш.

Адзначым, «элегізм» класіка нашай літаратуры мае выразны *экзістэнцыяльны характар*: адбываецца прымірэнне лірычнага героя з абставінамі (хай будзе, як ёсць) і, разам з тым, яно сведчыць аб працэсе захавання годнасці і «самасці» ім (яно – як ёсць, і я – таксама як ёсць). У сувязі з гэтым працытуем наступныя радкі: «Паломаны жыццём, чакаючы магілы, / Радзімая Зямля, прынікнуў я к табе, / І бодрасць ты ўліла ў слабеючыя жылы, / Зварушыла маёй душы драмаўшай сілы, / І месца ў ёй з тых пор няма ўжо больш жальбе» [1, с. 119].

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

У М. Лермантава таксама выяўляецца «шматкроць» паўтораны пафас адзіноты, пачынаючы ранняй і заканчваючы лірыкай сталай пары («Выхожу один я на дорогу»). Адзін, адзінокі, на крамянёвым шляху, у пустэчы, пад зоркамі, якія падаюць адна адной голас. Адчуваннем адзіноты, непрызнання зямлёй і небам прасякнута паэма «Демон», якая мае ажно восем рэдакцый, што сведчыць пра яе культавы характар у творчасці гэтага мастака слова. Адзінокі Пячорын у сваім расчараванні ў жыцці, у сваім духоўным двуаблічча. Аднак адзіноцтва рускага паэта пераважна не маркотнае, чулліва-трапяткое, як у М. Багдановіча, а «злоснае», больш трагедыйнае і трывожнае. Такі настрой становіцца гарантам дамінацыі элегіі ў яго паэзіі.

Лермантаўская элегія «судакранаецца» з одай і набывае характар грамадзянска-пафаснага твора, класічным узорам якога могуць быць славуты верш «Смерть поэта», яго першая частка, а таксама такія творы, як «Пророк», «Я не хочу, чтоб свет узнал…», «Спеша на север из далёка…»). Рускі паэт – майстар і медытатыўнай элегіі («Выхожу один я на дорогу…», «И скучно и грустно», «Оправдание», «Есть речи значенье», «Как часто, пёстрою толпою окружён…» , «Гляжу на будущность с боязнью» і інш.).

Рамантычны і сентыментальны пафас творчасці М. Лермантава ў цэлым прадвызначыў наяўнасць у яго спадчыне элегіі расчаравання, суму і смутку. І тут яго творчасць, на нашу думку, стаіць найбліжэй да творчасці класіка беларускай літаратуры. Падобнага характару творы пераважна палягаюць у абодвух аўтараў у інтымнай тэматыцы: сумныя прысвячэнні, партрэтныя замалёўкі, накіды-разважанні і г.д., так падобныя на імправізацыі. Адзін з іх – «Отчего»: «Мне грустно, потому что я тебя люблю, / И знаю: молодость цветущую твою / Не пощадит молвы коварное гоненье. / За каждый светлый день иль сладкое мгновенье / Слезами и тоскою заплатишь ты судьбе. / Мне грустно… потому что весело тебе» [3, с. 83].

М. Лермантаў у творчасці таленавіта спалучыў разнавіднасці пафасу – сентыментальны, гераічны, трагедыйны – і тым самым пачынаў працэс «змешвання» жанраў, адкрываў далейшыя пошукі мастакоў слова ў гэтым напрамку, у першую чаргу сімвалістаў, імажыністаў, экспрэсіяністаў. Да прыкладу, узорам ода-элегіі з'яўляецца агульнавядомы твор паэта «Пророк», у якім сыходзяцца высокае (душы прыгожыя памкненні, добрыя справы прарока – народнага заступніка) і нізкае (непрыняцце гэтых духоўных каштоўнасцей натоўпам, «сытымі», як пазней выкажацца У. Маякоўскі).

Скразным сарказмам, а для чытачоў – болем, прасякнутыя словы старцаў, адрасаваныя дзецям. Гэты боль яны самі не адчуваюць. Але невядома, на чыім баку будуць дзеці: «Смотрите: вот пример для вас! / Он горд был, не ужился с нами: / Глупец, хотел уверить нас, / Что бог гласит его устами! / Смотрите ж, дети, на него: / Как он угрюм, и худ, и бледен! / Смотрите, как он наг и беден, / Как презирают все его!» [3, с. 112].

Даволі спакойная споведзь прарока ў першай частцы верша пра перанесеныя пакуты з-за боскага дару («В очах людей читаю я / Страницы злобы и порока»; «В меня все ближние мои / Бросали бешено каменья»; «Из городов бежал я нищий») літаральна ўзрываецца васьмю апошнімі адычна-гімнічнымі радкамі, прамоўленымі вуснамі нядобразычліўцаў (пэўна, місія

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

прарока-заступніка радыкальна разыходзіцца з жыццёвымі прынцыпамі «фарысеяў»). Сюжэтна і пафасна верш «Пророк» блізкі да пастэрнакаўскага «Гамлета», адрозніваецца толькі тым, што маналог лірычнага героя М. Лермантава дапаўняецца «палымянай» прамовай яго ворагаў, чаго няма ў вершы аўтара «Доктара Жывага».

Рысы экзістэнцыялізму не ў меншай, а можа, у большай ступені характэрныя для паэзіі (у тым ліку – элегіі) і прозы М. Лермантава, чым М. Багдановіча. Пра гэта сведчаць славутыя паэмы «Демон», «Мцыри», раман «Герой нашего времени», вершы элегійнага характару «Сон», «Дума», «Не верь себе», «Любовь мертвеца», «Пророк», інш. У М. Багдановіча, на наш погляд, абсалютна адсутнічае дэманізм як «спадарожнік» элегійнай творчасці. У яго практычна няма ніводнай «злоснай» па настроі элегіі, што часта назіраецца ў М. Лермантава. І яшчэ, хоць абодвух аўтараў родніць, збліжае экзістэнцыялізм як «напрамак» перспектыўнага мыслення, у нашага паэта, думаецца, усё ж больш веры ў сябе, у свае сілы, крынічыць *надзея* на перасільванне трагедыйных абставін. М. Лермантаў жа раз за разам кідае ў натоўп выбуховае «А вы, надменные потомки...».

Калі браць апазіцыю «зямля – неба», дык яна выглядае наступным чынам (крыху забягаючы наперад, далучым да формулы і творчасць Максіма Танка):

у М. Лермантава зямля < за неба,

у М. Багдановіча зямля = небу,

у Максіма Танка зямля > за неба.

Невыпадкова ў сувязі з гэтым класік заходнебеларускай, а затым савецкай літаратуры ў адпаведнасці з вызначанай намі асаблівасцю творчасці шматразова падкрэсліць, што атрымаў адказ на свой ліст, напісаны плугам («Перапіска з зямлёй»), што «зямля – наша родная маці» («Шмат ты дзяцей узгадавала…»), ухваліць «толькі адну зорку – / Пяцікрылую далонь маці» («Не знаю…»), ушануе дарагія «азораныя Вечным агнём / Абеліскі» («Адны радаслоўную сваіх вершаў…»). Але і зоркі сусвет паэту блізкі і дарагі, таму адчувае ён сябе «раскрыжаваным» у «сусвеце каварным», паміж зямлёй і небам. І тут дарэчы яго верш, датаваны 1977 г., – «У далеч нязведаную…». Працытуем яго цалкам і паспрабуем адчуць, што гэта «зямны», мініварыянт лермантаўскага «Демона»: «У далеч нязведаную задыяк, / Здаецца мне кліча, нібыта. / А я не магу і дагэтуль ніяк / Апошняй загадкі разблытаць: / За што мяне раскрыжаваць так змаглі / У гэтым сусвеце каварным, / Прыцвікаваўшы руку да Зямлі, / Другую – да зоркі Палярнай» [5, с. 318].

Элегізм Максіма Танка «завуаляваны», больш дыдактычны (да гэтага і верлібр абавязвае), чым у М. Багдановіча. Абсалютная большасць яго вершаў элегічнага характару сумяшчае ў сабе жанравыя адзнакі і оды, і прытчы, і грамадзянска-публіцыстычнага пласта лірыкі. Гэта якраз і ёсць прыкмета новага часу – часу выпрацоўкі прынцыпаў свабоднага, па словах Яна Чыквіна, адкрытага мадэрнісцкага і постмадэрнісцкага пісьма. Паэт ідзе да жанравага і стылёвага сінтэзу, не ўласцівага ў такой, як у яго ступені, ні М. Лермантаву, ні М. Багдановічу. Напрыклад: «Я зайздрошчу / Біблейнаму Стварцу часамі: / Зрабіць першую пару людзей / Яму собіла. / А далей, па закону / Перпетуум-мобіле, / Гома сапіенсы / Размнажаюцца самі, / Я ж, каб нейкага новага / Даць

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

бедачыну, / Кожны раз мушу зноў / Перамешваць гліну» [5, с. 462]. Цяжка аднесці гэты твор да нейкага аднаго жанру: гэта ў адначассе і ода, і прытча, і сатыра, і падкуслівая іронія, і элегія сумнага роздуму на тэму, чаму паэту так цяжка, нават цяжэй, чым Створцу, «стварыць» чалавека.

Максім Танк сам называе свае творы то антысанетам, то рыцарскай баладай, то паўказкай, то дыялогам, то прытчай, піша хоку, працягваючы традыцыі М. Багдановіча, яго намаганні ўзбагаціць беларускую літаратуру мастацкім эксперыментам, вышэй узняць планку жанрава-стылёвых пошукаў у ёй. Агульнавядомыя таксама поспехі Максіма Танка, майстра верлібра, які дае яму шырокія магчымасці для разняволенай размовы з чалавекам, чалавецтвам, сусветам па вечных праблемах быцця. Гаворачы тэзісуальна, адзначым, што Максім Танк-філосаф у лірыцы больш дыдактычны, адкрыта павучальны, чым некалькі сузіральны, замкнёны ў коле свайго асабістага «Я» М. Багдановіч. У дадзеным выпадку ён бліжэйшы да М. Лермантава.

Наша размова не мела б грунтоўных падстаў, калі б мы не знайшлі хоць адно сведчанне пра пазітыўныя адносіны Максіма Танка да Максіма Кніжніка. У кнізе «Хай будзе святло» (1972) чытаем пранікнёныя радкі пра папярэдніка: «Часта з трывогаю, / Разгортваю папялішчы песень, / Бо ў стольких не знаходзіў / Ніводнай іскры, / Але на вогнішчы тваім – / Хоць над ім безліч прашумела / Лістападаў і дажджоў! – / Кладу свае далоні – / І адчуваю полымя жывое. / Угледзеўшыся – бачу яго водсвет, / Прыпаўшы вуснамі – / Апальваю іх да болю» [4, с. 204].

Тры постаці. Велічныя, высакародныя. Створанае імі – «жывое полымя», да якога прыпадаем мы вуснамі, апальваючы «іх да болю», да якога будуць прыпадаць і нашы нашчадкі.

**Літаратура**


1. Багдановіч, М. Поўны збор твораў : у 3 т. / М. Багдановіч. – Мінск, 1992–1995. – Т. 1 : Вершы, паэмы, пераклады, наследаванні, чарнавыя накіды. – 1992.
2. Багдановіч, М. Поўны збор твораў : у 3 т. / М. Багдановіч. – Мінск, 1992–1995. – Т. 2 : Маст. проза, пераклады, літаратурныя артыкулы, рэцэнзіі і нататкі, чарнавыя накіды. – 1993.
3. Лермонтов, М.Ю. Собрание сочинений : в 4 т. – Т. 1 : Стихотворения 1828–1841 гг. / М.Ю. Лермонтов. – М., 1986.
4. Танк, М. Выбранае : вершы / М. Танк. – Мінск, 1993.
5. Танк, М. Мне пару крыл дало юнацтва… : выбраная лірыка / М. Танк. – Мінск, 2003.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ